# УЧАСТНИКИ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

*Ніхто не забыты, нішто не забыта*

1 II, 1985, 19/IX

## ПОДЗВІГ КАМІСАРА

АБАРОНА Гомеля ад гітлераўскіх захопнікаў у пачатку Вялікай Айчынай вайны — адна з самых гераічных старонак яго гісторыі. Нямала подзвігаў здзейснілі тады абаронцы горада. Аб адным з іх мы даведаліся зусім нядаўна. Матэрыялы, сабраныя юнымі следапытамі, сталі часткай экспазіцыі музея баявой славы СШ № 30 г. Гомеля.

...Жнівень 1941 года. Ідуць цяжкія, кровапралітныя баі за наш абласны цэнтр. 12-ты асобны матацыклетны полк 219-й матарызаванай дывізіі 21-й арміі Цэнтральнага фронта абараняў Гомель з паўночнага ўсходу. Але, выкарыстоўваючы перавагу ў жывой сіле і тэхніцы, да 21 жніўня фашыстам удалося адцясніць яго з-пад Веткі ў раён Клімаўка — Зябраўка — Цярахоўка. У ходзе гэтых баёў быў цяжка паранены і кантужаны камандзір палка маёр Канстанцін Рыгоравіч Нос. Тады камандаванне палком прыняў на сябе яго намеснік па палітычнай частцы — батальённы камісар Пётр Міхайлавіч Пастухоўскі. Знаходзячыся ў падраздзяленнях, ён не раз палымяным словам і асабістым прыкладам натхняў байцоў на ратныя подзвігі ў імя Радзімы.

А ноччу быў атрыманы загад — выбіць гітлераўцаў з занятых імі пазіцый, каб даць магчымасць прайсці па чыгунцы апошняму саставу з важным грузам з Навабеліцы на ўсход.

22 жніўня на досвітку пасля стараннай разведкі П. М. Пастухоўскі ўзняў полк у атаку. Яна аказалася настолькі нечаканай, што, пакінуўшы на полі бітвы дзесяткі салдат і афіцэраў забітымі, вораг у паніцы адступіў. Але, атрымаўшы падмацаванне, праціўнік зноў кінуўся да чыгункі. Завязаўся нdroўны бой. Умела выкарыстоўваючы процітанкавыя гранаты і бутэлькі з гаручай сумессю, нашы воіны спынілі танкі і самі перайшлі ў контратаку.

— Наперад, за Радзіму! — пачулі аднапалчане голас камісара. — Ура! — грымела над полем. Але ў гэты час куля фашысцкага аўтаматчыка смяротна параніла Пастухоўскага. Падаючы на зямлю, ён бачыў, як па чыгунцы грукатаў састаў.

— Усё, загад выкананы! — гэта былі яго апошнія словы.

Прайшлі гады. Разам з Рыгорам Іванавічам Барсуком, ваенруком СШ № 30, палкоўнікам у адстаўцы, мы пабывалі на станцыі Зябраўка, ля якой 44 гады назад загінуў батальённы камісар П. М. Пастухоўскі. Час даўно параўняў з зямлёй акопы і варонкі, але памяць аб герою жыве ў сэрцах людзей.

— Працягваючы пошукавую работу, пачатую піянерамі Клімаўскай васьмігадовай школы, якія па ўспамінах удзельніка таго бою маёра Л. І. Гуржаса і сведак гэтай бітвы знайшлі магілу Пятра Міхайлавіча, — расказвае Р. І. Барсук, — нашы следапыты сабралі многа матэрыялаў пра Пастухоўскага. З адказу Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны СССР стала вядома, што Пётр Міхайлавіч Пастухоўскі нарадзіўся 25 чэрвеня 1905 года ў горадзе Вялікія Лукі Пскоўскай вобласці ў сям'і чыгуначніка. Закончыўшы школу, пайшоў па дарозе бацькі — працаваў на паравоза-вагонарамонтным заводзе, затым выбіраўся сакратаром райкома камсамола, быў на прафсаюзнай рабоце. У 21 год стаў камуністам. Пасля прызыву ў армію ён — інструктар палітаддзела механізаванай брыгады, выкладчык гісторыі КПСС і адказны сакратар партыйнай камісіі пры палітаддзеле Харкаўскага бранятанкавага вучылішча.

Усюды, куды б яго ні накіроўвала партыя, Пётр Міхайлавіч паказаў сябе чулым, прынцыповым чалавекам, аддаючы ўсе сілы, вопыт і веды ўмацаванню Чырвонай Арміі.

...Прах батальённага камісара П. М. Пастухоўскага быў перанесен у вёску Калініна Гомельскага раёна і пакоіцца цяпер побач з магілай Героя Савецкага Саюза М. М. Куюкова. У нашай памяці назаўсёды засталіся тыя, хто абараняў і вызваляў Гомельшчыну. Тыя, што загінулі, але навечна жывуць у нашых сэрцах.

Хвалюючай была сустрэча ў СШ № 30 з жонкай героя — Галінай Фёдараўнай Пастухоўскай. Прыязджаў у Калініна і яго сын — генерал Генадзь Пятровіч Пастухоўскі. Што ж — «байцоў не радзее строй...» Ён, як і бацька, звязаў сваё жыццё з арміяй.

**У. ЛАРЫЁНАЎ,**
**экскурсавод Гомельскага бюро падарожжаў і экскурсій.**

